Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 ВЕРАСНЯ 2013 г. СЕРАДА № 165 (27530) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Кажуць, у вёсцы — не схавацца. Усё тут, маўляў, на далоні — і добрае, і дрэннае. Ледзь нешта гаспадыня недарабіла, недагледзела, і пайшла пагалоска...

Прыпомніўшы творы класічнай літаратуры, карэспандэнт «Звязды» згадаў, што ва ўстановы такога кшталту, а менавіта ламбарды, людзі звярталіся яшчэ паўтара стагоддзя таму, калі іх фінансы спявалі рамансы. СТАР. 3

Традыцыйна ў першыя дні новага навучальнага года школьнікі пішуць сачыненне на тэму «Як я правёў лета». Вось і «Звязда» папрасіла некалькіх публічных асоб падзяліцца ўражаннямі... СТАР. 6

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў РАЗВІЦЦІ СУПРАЦОЎНІЦТВА З ПАР»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пацвярджае зацікаўленасць беларускага боку ў развіцці супрацоўніцтва з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў учора на сустрэчы з міністрам міжнародных сувязяў і супрацоўніцтва ПАР Маітэ Нкаана-Машабанэ, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Як адзначыў Прэзідэнт, адносіны паміж дзвюма краінамі ў галіне палітыкі і дыпламатыі складваюцца даволі паспяхова. «Нашы вышэйшыя службовыя асобы, міністры не адзін раз наведвалі Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку. У нас пастаянны кантакт. Вельмі паспяхова ў частцы перагаворнага працэсу развіваюцца кантакты прадпрымальнікаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы нядрэнна вывучылі вашу краіну, ведаем эканоміку ПАР. Адсюль наша зацікаўленасць у супрацоўніцтве», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, адзначыў, што ПАР мае найбагацейшыя запасы карысных выкапняў, актыўна развівае сельскую гаспадарку. У цэлым беларуская і паўднёва-афрыканская эканомікі ўзаемадапаўняльныя.

«Мы запрасілі Прэзідэнта ПАР наведаць Беларусь. Ён згадзіўся ў бліжэйшы час прыехаць сюды. Мы надаём гэтаму вельмі вялікае значэнне. Упэўнены, калі гэты візіт адбудзецца, ён дасць дадатковы штуршок развіццю нашых адносін», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

У гэтым плане Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што візіт у Беларусь міністра міжнародных сувязяў і супрацоўніцтва ПАР з'яўляецца знакавым: «Мы вельмі разлічваем, што вы бліжэй пазнаёміцеся з нашай краінай. Мы ў гэтым зацікаўлены, паколькі ад такіх ключавых фігур залежаць перспектывы нашага супрацоўніцтва».

У сваю чаргу Маітэ Нкаана-Машабанэ падзякавала за супрацоўніцтва, якое гістарычна развіваецца паміж дзвюма дзяржавамі, эканамічныя кантакты і цёплы прыём, аказаны ёй на беларускай зямлі. «Я прывезла з сабой самыя цёплыя прывітанні ад Прэзідэнта ПАР Джэйкаба Зумы. Ён з радасцю прыняў ваша запрашэнне наведаць Беларусь. Мы ажыццявім гэты візіт у 2014 годзе, пасля таго як у ПАР пройдуць выбары», — сказала міністр.

Маітэ Нкаана-Машабанэ згадзілася, што эканомікі Беларусі і ПАР узаемадапаўняюць адна адну. «Мы знаходзімся тут, каб закласці асновы гэтага супрацоўніцтва і ў далейшым рэалізаваць увесь яго патэнцыял», — адзначыла яна.

Паводле слоў міністра, на праведзеных у Беларусі сустрэчах былі дакладна вызначаны тыя напрамкі супрацоўніцтва, дзе ёсць патэнцыял для развіцця ўзаемадзеяння. «Гэта такія сферы, як распрацоўка карысных выкапняў. Тут Беларусь мае неабходны вопыт і абсталяванне, якое мы можам выкарыстоўваць. Сельскагаспадарчы сектар таксама адкрывае шырокія гарызонты супрацоўніцтва і можа выкарыстоўвацца Беларуссю не толькі для выхаду на паўднёва-афрыканскі рынак, але і на рынкі іншых краін рэгіёна», — заявіла Маітэ Нкаана-Машабанэ.

■ Абрысы Айчыны

ПАЎСТАГОДДЗЯ З БЕЛАРУСКАЙ ПРАПІСКАЙ

Амаль 50 гадоў таму расійская вёска Каськова ўвайшла ў склад Беларусі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гэта лёс. Нарадзіцца ў месцы, з якога пачынаецца твая Радзіма! Можна пражыць цэлы век, адчуваючы сябе апошнім, крайнім, але так і не зразумець, што менавіта ў крайніх, памежных вёсках і ёсць наш пачатак. Можна ўжо ад нараджэння ісці па зямлі, па адзінай вуліцы сваёй вёскі з пачуццём сапраўднага гонару, што і ты ёсць гэты пачатак...

Мы не станем аспрэчваць асабістых перакананняў тых, хто не лічыць ускрай дзяржавы яе пачаткам. Абрысы Айчыны — гэта кароткія фотарасповеды пра цэлыя населеныя пункты, лёс якіх быць памежнымі. Упершыню рубрыка з'явілася на старонках «Звязды» восем гадоў таму, каб асвятляць жыццё вёсак, пасёлкаў і хутароў уздоўж мяжы з Расіяй, Украінай, Польшчай, Літвой і Латвіяй. Мы шукаем цікавыя факты і самабытных людзей на гэтых украінных землях. Знаходзім і хочам падзяліцца ўбачаным з чытачамі.

Сёння завітаем у вёску Каськова, якая знаходзіцца ў Мсціслаўскім раёне на самай мяжы з Расійскай федэрацыяй, побач з важным гістарычным шляхам з Магілёва і Мсціслава на Смаленск і Маскву.

Адзін з гаспадароў Каськова — Мікалай Савушкін (на фотаздымку), для якога ў назве роднай вёскі гучыць і бачыцца так шмат: і ветлівыя твары суседзяў, і добрыя вокны іх гасцінных дамоў, і рака Сож з шырокім пойменным лугам, на якім пасецца памочнік — конь Малыш. СТАР. 4

ЦЫТАТА ДНЯ

Пётр ПРАКАПОВІЧ, намеснік прэм'ер-міністра:

«Для нармалізацыі сітуацыі ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Беларуськалій» спатрэбіцца пэўны перыяд часу — ад двух да чатырох месяцаў, я думаю, — каб аднавіць рынкі, набраць абароты і працаваць далей. Цяпер ідзе пастаянная работа па аднаўленні існуючых сувязяў і стварэнні новых кантактаў. Ужо ёсць пагадненні на пастаўку 3 млн тон калійных угнаенняў з Арабскімі Эміратамі, Катарам і іншымі краінамі. Упэўнены, што неўзабаве мы пачнём прадаваць такія ж аб'ёмы прадукцыі, як раней, а можа быць, і большыя — у свеце ж нічога не памянялася: як куплялі калійныя ўгнаенні, так і будуць купляць, таму што без іх не забяспечыць нармальны ўзровень харчавання».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.09.2013 г.

Долар ЗША	9020,00	▲
Еўра	11880,00	▼
Рас. руб.	270,50	▼
Укр. грыўня	1107,77	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 17°
Віцебск	+ 16°
Гомель	+ 16°
Гродна	+ 18°
Магілёў	+ 17°
Мінск	+ 15°

■ Парламенцкія сустрэчы

УРАЧ ЗМОЖА АДМОВІЦЦА РАБІЦЬ АБОРТ

Законапраект аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя» — адзін з тых, што найбольш абмяркоўваюцца ў грамадстве. З шэрагам гучных прапаноў, сярод якіх — забарона абортаў, выступалі прадстаўнікі Праваслаўнай і Каталіцкай Цэркваў у Беларусі, урачы прапаноўвалі ўскласці на п'яніц выдаткі на іх лячэнне, гучалі прапановы ўвесці плату за лячэнне ў дзённых стацыянарах... У якім выглядзе законапраект падрыхтаваны да першага чытання, запланаванае на восеньскую сесію, «Звяздзе» расказаў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы Валянцін МІЛАШЭЎСКІ.

— Валянцін Станіслававіч, якая галоўная мэта дапаўненняў у Закон «Аб ахове здароўя»?

— Прафілактыка хвароб. У аснову ўсёй сістэмы аховы здароўя пакладзены клопат пра чалавека, умацаванне яго здароўя і павелічэння працягласці жыцця. Аднак само наша насельніцтва недастаткова клапоціцца аб сваім здароўі, не жадае адмаўляцца ад шкодных звычак, весці здаровы лад жыцця. СТАР. 2

ЗАРОБАК У ВАЛЮЦЕ Ў РАЗЛІК ПЕНСІІ НЕ ЎКЛЮЧАЕЦЦА

Якія дакументы неабходны для прызначэння пенсіі? Што рабіць, калі якіясьці паперы страчаны? І наогул, хто іх павінен збіраць — орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, наймальнік або сам работнік? Адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай і падачай дакументаў для прызначэння пенсій, можна было атрымаць у ходзе анлайн-канферэнцыі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

У ёй бралі ўдзел начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Наталля МУРАШКЕВІЧ, начальнік аддзела арганізацыі пенсійнага забеспячэння Ніна ЛУЗІНА, начальнік аддзела пенсійнага заканадаўства Алена ГОМАРАВА і іншыя спецыялісты міністэрства.

Тамара Супрановіч, Магілёў:

— З 1 красавіка 1983 года працую фельчарам выязной брыгады хуткай медыцынскай дапамогі. Спачатку — 4 гады (да чэрвеня 1987 года) — у Слаўгарадскай ЦРБ. Затым — у Магілёве. У жніўні 2014 года споўніцца 50 гадоў. Ці маю я права на пенсію за выслугу гадоў, якія дакументы неабходны для прызначэння пенсіі і хто павінен іх рыхтаваць?

Ніна ЛУЗІНА:

— Дакументы, неабходныя для прызначэння пенсіі, афармляюцца працадаўцам па месцы апошняй працы. Для прызначэння пенсіі за выслугу гадоў неабходны дакументы аб стажы, у тым ліку спецыяльным (удакладняльныя даведкі працадаўцаў) і прафесійным (звесткі Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва). Таксама неабходны даведкі аб заробку (да 2003 года). З улікам канкрэтнай сітуацыі могуць быць запатрабаваны дадатковыя дакументы (напрыклад, дакументы аб змене прозвішча, пасведчанні аб нараджэнні дзяцей). Вычарпальны пералік неабходных дакументаў заканадаўствам не прадугледжаны. Рашэнне аб прызначэнні пенсіі прымаецца органам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне на падставе пададзеных яму дакументаў.

Права на пенсію за выслугу гадоў прадастаўлена фельчарам выязных брыгад станцый хуткай і неадкладнай медыцынскай дапамогі і фельчарам выязных брыгад аддзяленняў хуткай і неадкладнай медыцынскай дапамогі пры гарадскіх, цэнтральных раённых і іншых бальніцах. СТАР. 2

ЗАВОЧНАЯ «ПРАМАЯ ЛІНІЯ»

І пра страўнік, і пра печань

Пытанні прафілактыкі і лячэння стрававода, страўніка, кішэчніка, печані і падстраўнікавай залозы можна пакінуць па нумары газеты «Звязда» 8 (017) 287 18 29 да 5 верасня. На старонках нашага выдання на іх адкажуць дацэнты 2-й кафедры ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдаты медыцынскіх навук, урачы-гастраэнтэролагі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Мікалай КАПРАЛАЎ і Ірына ШАЛАМІЦКАЯ.

■ Прыватная арэнда

БЮДЖЭТНЫХ КВАТЭР У МІНСКУ НЕ ЗАСТАЛОСЯ

Спецыялісты агенцтваў нерухомасці прапануюць кліентам арэнднае жыллё коштам ад 500 USD

Яшчэ ў першай палове жніўня наша выданне прадказвала павелічэнне цэннікаў на прыватную арэнду прыкладна на 5—10%. Нам тады здавалася, што стандартная аднапакаёўка не можа рэальна каштаваць даражэй за 350—400 долараў. Моцны студэнцкі ажыятаж у апошняй дэкадзе жніўня практычна цалкам «вымыў» усё бюджэтнае арэнднае жыллё ў сталіцы. А што будзе далей? Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на бліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» паведаміла намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Аксана ЛУКАШЭВІЧ.

Выбару ўвогуле няма

Менавіта так катэгарычна заяўляюць аб наяўнасці бюджэтных кватэр на рынку спецыялісты агенцтваў нерухомасці. Толькі за апошнія некалькі тыдняў прапанова звычайных стандартных кватэр зменшылася ў некалькі разоў, а попыт працягвае павялічвацца. Хваля заяў ад патэнцыяльных кліентаў, якія хочуць здымаць параўнальна таннае жыллё (ад 300 да 450 долараў), у агенцтвах цяпер не рэгіструецца.

— Мы цяпер не заключаем дагаворы з кліентамі на нейкую нерэальную перспектыву аб магчымай таннай арэндзе, — тлумачыць сітуацыю спадарыня Лукашэвіч. — Грошы бяруцца толькі ў тых выпадках, калі на атрыманы заказ існуе рэальнае жыллё, а таму мы можам дапамагчы людзям з арэндай.

А вось у «засеках» агенцтваў нерухомасці сёння засталіся толькі дарагія кватэры. На рынку арэнды існуюць аднапакаёвыя кватэры прымальнай якасці, з добрым рамонтам і не вельмі старой мэбляй, кошт арэнды якіх пачынаецца ад 500 долараў. У такіх кватэрах бізнес-класа добрая кухня, вялікі халадзільнік, сучасная пральная машына і тэлевізар. Звычайных, стандартных кватэр без усіх гэтых бытавых «наваротаў» па меншым кошце на рынку сёння няма.

Тут адразу ўдакладню, што не існуе таннага жылля менавіта ў сегменце новай прапановы здымных кватэр, які кантралюецца агенцтвамі нерухомасці. Цэннік арэнды стандартных кватэр, якія здаюцца ўжо даволі працяглы час, застаецца і цяпер на значна меншым узроўні. СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АРМЕНІЯ ЎСТУПІЦЬ У МЫТНЫ САЮЗ

Адпаведную заяву па выніках перамоў падпісалі лідары Расіі і Арменіі . «Прэзідэнты пацвердзілі нацэленасць РФ і Рэспублікі Арменія на далейшае развіццё працэсаў эканамічнай інтэграцыі на Еўразійскай прасторы, — гаворыцца ў дакуменце. — У гэтым кантэксце прэзідэнт Рэспублікі Арменія Серж Саргсян заявіў аб рашэнні Рэспублікі Арменія ўступіць у Мытны саюз і зрабіць у гэтых мэтах неабходныя практычныя крокі, а ў далейшым удзельнічаць у фарміраванні Еўразійскага эканамічнага саюза».

ЯПОНІЯ ПАБУДУЕ ЛЕДЗЯНУЮ СЦЯНУ ВАКОЛ «ФУКУСІМЫ-1»

Улады Японіі маюць намер інвеставаць сотні мільёнаў долараў у пабудову падземнай ледзяной сцяны вакол ядзерных рэактараў АЭС «Фукусіма-1». Гэта неабходна для таго, каб спыніць уцечкі радыеактыўнай вады. Як заявіў прадстаўнік японскага ўрада, згодна з першапачатковай ацэнкай, праект запатрабуе каля 473 млн долараў інвестыцый. Сёння для ахалоджвання рэактараў запампоўваецца вада, аднак захоўваць яе ў вялікіх колькасцях уладальнік АЭС, кампанія «Тэрса», не ў стане. У апошнія тыдні было зафіксавана некалькі ўцечак заражанай вады, пасля чаго ўрад прыняў рашэнне ўмяшацца ў сітуацыю.

MICROSOFT НАБЫЛА NOKIA

Акцыі Nokia на пачатку таргоў у Хельсінкі ў аўторак узляцелі на 47% . Адразу пасля пачатку таргоў цэны выраслі з 2,96 да 4,36 долара за адну акцыю. Пазней кошт крыху знізіўся, і да поўдня акцыі Nokia таргаваліся на ўзроўні 4-4,2 долара. Рынкавая капіталізацыя кампаніі вырасла да 15,52 мільярда долараў. Рэкордны ў гісторыі фінскага тэлекамунікацыйнага гіганта рост акцый рушыў услед за паведамленнем аб тым, што кампанія прадае сваё падраздзяленне па вытворчасці і абслугоўванні мабільных тэлефонаў карпарацыі Microsoft. Найбуйнейшы ў свеце вытворца праграмнага забеспячэння дамовіўся аб набыцці мабільнага падраздзялення Nokia за 7,17 млрд долараў. Здзелка, як чакаецца, будзе закрыта ў I квартале наступнага года. Яе павінны ўхваліць акцыянеры Nokia і рэгулятары ў ЗША, ЕС і Фінляндыі.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЛЮБІМАЯ МЕЛОДЫЯ ЛЕЧЫЦЬ СЭРЦА

Музыка здольна ўмацаваць сэрца і паскорыць працэс рэабілітацыі «сардэчнікаў», перадае The Telegraph. Па словах кардыёлагаў, у прынцыпе, любы можа ацаніць тэрапеўтычны эфект музыкі. Дастаткова паставіць любімую мелодыю. Медыкі правялі эксперымент: яны падзялілі 74 «сардэчнікі» на тры групы. Першыя хадзілі на кардыягімнастыку на працягу трох тыдняў. Астатнія таксама займаліся, а яшчэ слухалі любімую музыку (дазвалялася ўключаць яе на 30 хвілін штодня). Апошняя група толькі слухала музыку.

Да канца эксперымента паказчыкі работы сэрца ў яго ўдзельнікаў палепшыліся. Здольнасць пераносіць фізічную нагрузку ў людзей з другой групы павысілася на 39%. Людзі, якія хадзілі толькі на гімнастыку, сталі лепш пераносіць нагрузку на 29%. А вось гурт меламанаў — на 19%. Пра тое, што сэрца добра працавала, сведчыў стан эндатэлію (пласт клетак, які высцілае сасуды). Падчас праслухоўвання музыкі выпрацоўваюцца важныя гармоны. Універсітэт Ніш даказаў: калі чалавек слухае сваю любімую мелодыю, у мозгу вызваляюцца эндарфіны. А яны пазітыўна ўплываюць на сасуды. Лепш выбіраць музыку без слоў, устрымлівацца ад цяжкага «металу» (павышае ўзровень стрэсу). Ідэальны варыянт — оперная музыка, класічныя кампазіцыі, радасныя мелодыі.

КОРАТКА

У Брэсцкай вобласці аднаразовую матэрыяльную дапамогу на падрыхтоўку дзяцей да школы атрымаюць 5,5 тысячы малазабяспечаных сем'яў.

У рэспубліцы распрацоўваецца спецыяльная камп'ютарная касавая сістэма (СККС), якая дасць магчымасць кантраляваць абароты ў сферы ігральнага бізнесу.

Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі вынесла на грамадскае абмеркаванне праект Тэхнічнага кодэкса існуючай практыкі (ТПК) «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. Адходы. Правілы абыходжання з камунальнымі адходамі». Тэкст дакумента размешчаны на афіцыйным інтэрнэт-сайце ведамства.

На тэрыторыі 10 мінскіх ЖРЭА да канца 2013 года плануецца абсталяваць амаль 11 тыс. дадатковых месцаў для часовага размяшчэння аўтамабіляў. З пачатку гэтага года ў мінскіх дварах было абсталявана амаль 7 тыс. дадатковых машына-месцаў.

Інтэрпал аб'явіў акцыянера «Уралкалія» Сулеймана Керымава ў міжнародны вышук. Як паведамлялася, акцыянер ААТ «Уралкалій» Сулейман Керымаў прыцягнуты Следчым камітэтам Беларусі ў якасці абвінавачанага па ўжо расследуемай крымінальнай справе.